■ Добры звычай

# СВЯТА «Ў КВАДРАЦЕ»

## Віншаванні і падарункі ад «Белай Русі» атрымалі матулі, чые дзеці нарадзіліся трэцяга ліпеня



Анастасія КАРЗЮК з сынам Міхаілам.

**Дзень Незалежнасці стаў адначасова і днём нараджэння для 181 маленькага грамадзяніна Беларусі. Па традыцыі ў кожным рэгіёне краіны павіншаваць маладых маці з двайным святам прыйшлі члены ўрада, дэпутаты, кіраўнікі адміністрацый раёнаў.**

Падчас акцыі «Белая Русь — з любоўю да дзяцей» прадстаўнікі арганізацыі разам з іншымі адказнымі асобамі наведалі пяць медыцынскіх установаў Мінска. Напрыклад, толькі ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры «Маці і дзіця» адбылася сустрэча з 15 мамамі. Акрамя добрых слоў, жанчыны атрымалі падарункі — падушкі і коўдрачкі для немаўлят.





⇧ Злева направа. Дырэктар РНПЦ «Маці і дзіця» Канстанцін ВІЛЬЧУК, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Генадзь ДАВЫДЗЬКА, кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска Дзмітрый ПЯТРУША.

⇦ Намеснік дырэктара па акушэрстве і гінекалогіі РНПЦ «Маці і дзіця» Святлана НАГІБОВІЧ.

**Генадзь ДАВЫДЗЬКА, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, старшыня РГА «Белая Русь»,** адзначыў, што акцыя насамрэч не аднамомантная і дзеці могуць разлічваць на далейшую падтрымку:

— За лёсам маленькіх грамадзян будзем сачыць ад першага і да апошняга званка ў школе, па меры магчымасцяў дапамагаць у жыцці. «Белая Русь» дзясяты раз праводзіць падобную акцыю, і мне хацелася б пажадаць дзецям, што з'явіліся на гэты свет у дзень сама вважнага для нашай краіны свята, каб яны былі любімымі і значнымі для сваіх бацькоў, важнымі і запатрабаванымі для Беларусі і свету.

На думку **кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска Дзмітрыя ПЯТРУШЫ,** вельмі сімвалічна вітаць дзяцей у Дзень Незалежнасці, бо аснова любой краіны — гэта яе жыхары.

Самім маладым маці акцыя таксама спадабалася. **Вольга ШКЛЯННІК** трымае на руках маленькую **Кацярыну**. Гэта ўжо другое дзіця ў сям'і, але матуля кажа, што шчасце не становіцца меншым:

— Лічу, вельмі добра, калі краіна ўмее рэагаваць не толькі на нейкія негатыўныя здарэнні, пасля якіх людзям патрэбна дапамога. Калі ўлада звяртае ўвагу і на нейкія дробныя радасці ў асобных сем'ях, дорыць падарункі — гэта здорава. Наогул імпануе сацыяльная скіраванасць акцый і дабрачынных праграм.

За пяць гадоў у сям'і **Анастасіі КАРЗЮК** нарадзілася трое дзяцей. Самы маленькі хлопчык хутка паедзе разам з мамай дадому да бацькі і дзвюх старэйшых сястрычак. Жанчына кажа, што ўсе тры разы нараджала ў цэнтры.

— Мой Міша з'явіўся на свет ноччу ў першыя гадзіны Дня Незалежнасці, яшчэ да салютаў і парадаў. Насамрэч не важна, што адбываецца, калі ты ўпершыню трымаеш на руках сваё дзіця, бо гэты момант ты абавязкова запомніш назаўсёды.

Цэнтр «Маці і дзіця» арыентаваны на аказанне акушэрска-медыцынскай дапамогі жанчынам з усёй Беларусі, таму большасць мам — прыкладна 70 % — не мінчанкі. **Намеснік дырэктара па акушэрстве і гінекалогіі РНПЦ «Маці і дзіця» Святлана НАГІБОВІЧ** расказала, што ў Беларусі, як і ва ўсім свеце, змяняецца падыход да родаў:

— Камфортныя ўмовы ствараюцца не толькі ў Мінску, але і па ўсёй краіне, пачынаючы ад цэнтральных раённых бальніц і заканчваючы галаўной установай, дзе мы з вамі цяпер знаходзімся. Шчаслівае мацярынства — гэта тое, чым Беларусь вядомая сярод суседзяў. Сёння змяняюцца тэндэнцыі ў падыходзе да родаў, так, дзеці з самага пачатку застаюцца разам з маці, існуе магчымасць партнёрскіх родаў, у момант нараджэння дазваляецца прысутнічаць блізкім для цяжарнай жанчыны людзям — мужу, бацькам, сяброўцы. Мы стараемся паспрыяць маці, каб яна адчувала сябе ў поўнай бяспецы і пры гэтым не хвалявалася за дзіця. Цяпер акушэрства намнога адрозніваецца ад таго, што было раней. Сучасная рададапамога мае свае тэхналогіі, якія павінны зрабіць працэс па магчымасці зручным, звяртаецца ўвага на псіхалагічны камфорт.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА**

# ХТО НЕ РЫЗЫКУЕ, ТОЙ НЕ НАЧАЛЬНІК



**Калі ў вас дзеці, вы менш ідзяце на рызыкі, адмаўляецеся ад павышэння, бо гэта дадатковая нагрузка, не пагаджаецеся на пасады, звязаныя з пераездам.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На Захадзе кар'ерысткі прывыклі нараджаць ва ўзросце пад 40. І на гэта ёсць шэраг прычын. Калі ў вас дзеці, вы менш ідзяце на рызыкі, адмаўляецеся ад павышэння (бо гэта дадатковая нагрузка), не пагаджаецеся на пасады, звязаныя з пераездам.

**Кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднай фінансавай карпарацыі ў Беларусі Вольга ШЧАРБІНА** тлумачыць сітуацыю на сваім прыкладзе:

— У мяне ад 100 да 200 камандзіровачных дзён на год. Былі сітуацыі, калі калегі ляталі з немаўлятамі. У нашай арганізацыі вітаецца мультырэгіянальны вопыт, таму хочаш прасоўвацца па кар'ернай лесвіцы — будзь гатовы да пераездаў. Калі мужчына пераязджае з-за работы, да гэтага ставяцца з разуменнем. Маўляў, нічога, жонка будзе дома з дзецьмі сядзець. Адваротная сітуацыя, калі змяніць месца жыхарства трэба з-за павышэння жанчыны, успрымаецца зусім інакш.

Калі разглядаць сітуацыю ў нашай краіне, уплыў стэрэатыпаў відавочны. Згодна з вынікамі даследавання ЮНФПА, большасць беларусаў — 64 % мужчын і 54 % жанчын — бачаць здабытчыкам у сям'і менавіта мужчыну. Але пры гэтым лічаць, што сваю лепту ў агульны бюджэт павінны ўносіць абое. Толькі 23 % сем'яў дзеляць хатнія абавязкі. Прытым што важнасць дзяцей для самарэалізацыі прыкладна аднолькавая для жанчын і мужчын (гэты крытэрый адзначылі 73 і 68 працэнтаў апытаных).

На думку **Вольгі КУЗНЯЦОВАЙ, вядучага менеджара групы фінансавання і развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця,** работадаўцы часам прад'яўляюць завышаныя патрабаванні да кандыдатак. «Мужчыну трэба адпавядаць крытэрыям вакансіі на 60 працэнтаў, каб атрымаць працу, а жанчыне — на 100. Нават больш», — лічыць яна.

Яшчэ адна цікавая заўвага прагучала на форуме: з мужчынамі прасцей працаваць, бо ў іх вектарнае мысленне. Яны думаюць, умоўна кажучы, як з пункта А трапіць у пункт Б. А спадарыні схільныя да эмацыянальных усплёскаў. Затое падыходзяць да справы больш скрупулёзна і педантычна. Дарэчы, для банкіраў жанчыны лічацца ўзорам вядзення бізнесу. Гэта датычыцца і дысцыпліны, і арганізацыі працы. Мяркуючы па статыстыцы аднаго з беларускіх банкаў, спадарыні больш адказныя пазычальнікі.

А вось стаць прадпрымальнікам жанчынам часта перашкаджае тое, што яны не вераць у сябе. Летась цэнтр эканамічных даследаванняў BEROC праводзіў апытанне фокус-групы. Аказалася, што сем з дзесяці прадстаўніц прыгожага полу, якія хочуць пачаць свой бізнес, так яго і не запускаюць. Сярод прычын на першым месцы — няўпэўненасць ва ўласных сілах. Часта няма падтрымкі сярод сям'і і сяброў. Блізкія людзі могуць казаць: «Навошта табе гэты бізнес, сядзі дома». А такая прычына, як адсутнасць фінансаў, — адна з галоўных для жыхарак сельскай мясцовасці, але не для гараджанак.

Меншы ўзровень беспрацоўя сярод жанчын тлумачаць тым, што яны пагаджаюцца на нізкааплатную работу. Але тут ёсць і іншы бок: спадарыні, якім грамадства не навязвае ролю здабытчыка, больш вольныя ў выбары прафесіі. Калі мужчына арыентуецца на галіну дзейнасці, дзе будзе больш зарабляць, жанчына можа выбраць спецыяльнасць для душы.

Магчыма, многія перашкоды для кар'ернага росту — надуманыя? **Партнёр адвакацкага бюро Аляксандр ХРАПУЦКІ** прытрымліваецца такога пункту гледжання.

— Той, хто стараецца, усяго даб'ецца. Я не бачу праблемы. Акрамя таго, што я працую адвакатам, я яшчэ выкладаю ва ўніверсітэце. Звычайна тым, хто не з'яўляўся на парах, на экзамене стаўлю «двойку». І вось здавала іспыт дзяўчына. На занятках не была, казала, што сядзела з дзіцем. Адказвала выдатна. Я нават стаў прыглядацца, ці няма навушніка. Але дзяўчына насамрэч падрыхтавалася, усё вывучыла. Таму я лічу, што ўсё можна паспяваць.

— Мне здаецца, жанчынам варта самім вызначыцца, ці хочуць яны станавіцца лідарамі, — дзеліцца **прадстаўнік ЮНІСЭФ у Беларусі Рашэд Мустафа САРВАР.** — Бо калі ідзе абмеркаванне павышэння пенсійнага ўзросту, напрыклад, да мужчынскай планкі ці скарачэння дэкрэтнага водпуску, яны самі выказваюцца супраць.

Бізнесвумен пагаджаюцца: сёння сумяшчаць працоўныя і хатнія абавязкі значна прасцей. Частку абавязкаў ты можаш перакласці на плечы клінінгавых кампаній, прыватных садкоў. Плюс знайсці дыстанцыйную работу ці з гнуткім графікам.

А вось тое, што жанчыны часам выбіраюць загадзя пройгрышную лінію паводзін, — можа стаць перашкодай. Ёсць дзве крайнасці: пазіцыя «я дзяўчына, таму стаўцеся да мяне інакш» і адчайная спроба стаць «сваім» — хадзіць з калегамі-мужчынамі ў лазню, піць алкаголь нароўні. Што рабіць? Заставацца сабой і быць прафесіяналам.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**